# Знак вады

Аўтор: пресс-релиз
23.07.2011 07:54

2 жніўня 2011г. а 17-й гадзіне ў вялікай зале **Музея сучаснага выяўленчага мастацтва** адбудзецца адкрыццё **выстаўкі жывапісных твораў Васіля Касцючэнкі "Знак вады".**

*"Вада – першааснова жыцця, адна з адвечных стыхій, будуючых свет. Гэта пачатак усяго Існага, сутнасць і неабходная умова нашага існавання. Вада стварае кожнага з нас, пачынаючы разам з намн такі нядоўгі чалавечы шлях. Яшчэ ў лонні маці яна абмывае нашы босыя ногі ў ззяцінстве сваімі срэбнымі росамі, спявае нам пра каханне і бясконцую радасць жыцця сваімі гучна-каляровымі вяселкамі. Цешыть нас грыбньтмі дажджамі, яна заварожвае люстэркамі азер, іскрыстымі вадападамі, але бывае яна і іншай: нястрыманай у сваей неверагоднай моцы, топіць у хвалях караблі, разбурае дамы і атакую страшньші цунамі гарады.*

*Стыхія вады, як і наша жыцце, не прадсказальная, цякучая як і само жыцце. Нават у пяшчотньш напаўненні марскіх хваляў, крыецца разбуральная энэргія вады. Як і усякая стыхія, вада падае нам знакі сваей разбуральнай моцы.*

***"Знак Вады" – Арт-праект мастака Васіля Касцючэнкі***
*, які уключае шэраг жывапісных палотнаў а вадзе, як высноўнай субстанцыі жыцця.*

*Знак Вады – архітып нашай свядомасці, спалучэнне не спалучальнага, Знак Гармоніі і Хаосу, Знак Жыцця і разбурэння"*

***(В.Касцючэнка).***

**Касцючэнка Васіль Кузьміч**

Нар. 25.2.1953г. у в.Васільеўка Гомельскай вобл.

1974 – скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута.

Удзельнік мастацкіх выставак з 1976г. З 1987 – выкладчык Мінскага мастацкага вучылішча імя А.К.Глебава.

З 1988 – сябра Беларускага саюзу мастакоў.

2006 -- лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідента Рэспублікі Беларусь у галіне выяўленчага мастацтва.

Персанальныя выстаўкі: 2006, сакавік -- "Galleri Kretsen", Швецыя.

2006, май - персанальная выстаўка, галерэя Балтыйскага Арт-мастацтва, Вільнюс.

2006, верасень -- галерэя "Тызенгауз", Гродна.

2008, чэрвень-ліпень --  "Імёны", ЦДМ, Масква.

2009, май -- "Цяпло колера", Нацыянальны мастацкі музей РБ, Мінск.

*Выстаўка працягнецца па 13 жніўня 2011г.*

+375 29 288-24-68, отдел выставок

